***Голубева Я. А.***

# ІМЁНЫ МЕДЫКАЎ У НАЗВАХ ВУЛІЦ ГОРАДА МІНСКА

***Навуковы кіраўнік ст. выкладчык Ратынская Н. В.***
*Кафедра беларускай і рускай моў*
*Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт, г. Мінск*

На сённяшні дзень у горадзе Мінску налічваецца амаль 1300 вуліц. Мэтай гэтай працы было выявіць тыя вуліцы, назвы якіх звязаны з імёнамі медыкаў, даследаваць іх уклад у беларускую і сусветную медыцыну. Акрамя таго, адзначыць колькасць вуліц, якія атрымалі свае назвы ў гонар асоб, звязаных з гісторыяй і культурай Беларусі.

Падчас працы былі прааналізаваны матэрыялы Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта, а таксама такія крыніцы, як СМІ, Энцыклапедыя БССР і іншыя. У ходзе даследавання было выяўлена, што ў сталіцы налічваецца 7 вуліц, названых імёнамі медыкаў. З іх дзве маюць назвы ў гонар беларускіх урачоў: Клумава, Скарыны. Гэта вялікія асобы, якія займаліся не толькі медыцынай. Так, Францыск Скарына абараніў доктарскую дысертацыю па медыцыне ў сценах Падуанскага ўніверсітэта і таксама пераклаў Біблію на старабеларускую мову, чым садзейнічаў распаўсюджванню асветы на беларускіх землях. Яўген Клумаў узначальваў 2-ю гінекалагічную клініку, акрамя таго, у гады вайны заснаваў падпольную групу, якая забяспечвала партызан медыкаментамі і перавязачным матэрыялам, захоўвала жанчын ад высылкі ў гітлераўскую Германію. Астатнія пяць вуліц - Сямашкі, Бехцерава, Паўлава, Сечанава і Філатава – названы ў гонар расійскіх вучоных-медыкаў. Працэнт вуліц, звязаных з гісторыка-культурнымі дзеячамі складае 6%.

Такім чынам, былі зроблены наступныя высновы: выдзелена невялікая колькасць вуліц, што атрымалі свае назвы ў гонар гісторыка-культурных дзеячаў Беларусі. Вуліц жа, названых імёнамі медыкаў, у горадзе Мінску налічваецца вельмі мала - усяго 7. Беларуская гісторыя медыцыны на сённяшні час ведае імёны вялікіх ўрачоў, якія ўнеслі дастойны ўклад не толькі ў беларускую, але і ў сусветную медыцыну. Таму мы і нашы наступнікі павінны несці адказнасць за захаванне памяці аб іх і іх дасягненнях.

Репозиторий БГМУ